*В. І. ВЯРБІЦКАЯ*

# КАШТОЎНАСЦІ САЦЫЯЛЬНЫХ СУБКУЛЬТУР І ІХ АДЛЮСТРАВАННЕ Ў ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯКУБА КОЛАСА

*Прааналізаваны змест і сутнасць субкультур, адлюстраваных у шэрагу твораў Якуба Коласа. Вызначаны асноўныя элементы субкультур, якія сфарміраваліся ў пэўных сацыяльных групах беларускага грамадства (сялян, мяшчан, інтэлігенцыі, дзяцей). Выказана меркаванне аб культуралагічнай інтэнцыі творчай спадчыны народнага паэта Беларусі.*

Беларуская супольнасць неаднародная. Яна ўключае акрамя асноўнага этнічнага ядра і пэўныя сацыяльныя групы са спецыфічнымі этнаграфічнымі, саслоўнымі, канфесіянальнымі, функцыянальнымі, дэмаграфічнымі і іншымі прыкметамі. З сацыяльнай стратыфікацыі грамадства вынікае і адпаведная дыферэнцыяцыя культуры, якая дэтэрмінуецца розніцай сацыяльных функцый груп людзей, іх ладу жыцця, матэрыяльнымі сродкамі і сацыяльнымі дабротамі, ідэалогіяй і сімволікай сацыяльнай прэстыжнасці. Абазначаныя дыферэнцаваныя сегменты агульнай культуры беларускай супольнасці паступова склаліся ў сацыяльныя субкультуры. Субкультура як адна з самых яркіх праяў сацыякультурнага быцця беларускага грамадства застаецца, аднак, да гэтага часу малаасэнсаваным феноменам. Дастаткова сказаць, што да сённяшняга часу айчынная і замежная культуралогія не выпрацавала нават адзінай дэфініцыі субкультуры.

Беларускае грамадства XX ст. уяўляла сабой мазаіку з сукупнасці сацыяльных страт. Так, у Беларусі на мяжы XIX і XX стст. пражывала 8 518 247 чалавек. Большасць насельніцтва знаходзілася ў сельскай мясцовасці – 5 270 812 жыхароў. Гарадское насельніцтва Беларусі складала 990 тыс. чалавек. Аднак сацыяльны і этнічны склад сельскага і гарадскога насельніцтва быў неаднародным. Вышэйшыя саслоўі (шляхта, духавенства) сярод беларусаў складалі 5,89% ад гарадскога насельніцтва і 1,22 % ад сельскага. Больш за палову гараджан (53,2%) складалі яўрэі, рускія, палякі [1, с.221].

Такім чынам, субкультурнымі носьбітамі ў Беларусі ў перыяд, калі распачыналася творчая дзейнасць Якуба Коласа, з’яўляліся сяляне, мяшчане, рабочы клас, служачыя, інтэлігенцыя, дзяржаўныя і палітычныя дзеячы, полаўзроставыя, этнічныя, рэлігійныя і іншыя супольнасці. Кожная з абазначаных супольнасцей стварала сваю субкультуру як асобую сферу культуры, цэласнае ўтварэнне ўнутры пануючай беларускай культуры, якое адрознівалася ўласнымі каштоўнасцямі, звычаямі, нормамі і карцінай свету.

Дыскурс тэкстаў мастацкай спадчыны дае падставу сцвярджаць, што ў ёй утрымліваецца шырокі сегмент сацыяльных субкультур. У спадчыне беларускага песняра ўсебакова раскрываюцца змест, каштоўнасці шэрагу субкультур. Найбольш грунтоўна ўвасоблена вясковая субкультура, творцамі якой з’яўляюцца сяляне, што выступаюць у ролі ахоўнікаў старажытнасці, духоўных традыцыйных каштоўнасцей народа.

У аснове вясковай субкультуры знаходзіцца своеасаблівая *карціна свету* сялянства. У пейзажнай коласаўскай лірыцы («Усход сонца» [3, с.82–83], «Першы гром» [3, с.204], «Адлёт жураўлёў» [3, с.135–136], «Лес» [3, с.157], «Зіма» [3, с.186 ] і інш.) паэт паказвае, што ў светаўспрыманні вясковых жыхароў ёсць нешта язычаскае, першароднае. Нават на паўсядзённыя, звычайныя для кожнага чалавека з’явы прыроды, як усход сонца, навальніца, мароз, вецер, хмаркі, селянін глядзіць як на жывое, бачыць у іх чалавечыя якасці і схільнасці [6, с.127–151]. Асабліва яскрава глыбінная адухоўленая сувязь вясковага жыхара з сусветам, космасам паказана ў паэмах «Сымон-музыка» [8], «Новая зямля» [10], трылогіі «На ростанях» [9].

«Вясковая субкультура, – адзначае беларускі культуролаг А. І. Смолік, – з’ява шматгранная, якая раскрывае сялянскі лад жыцця, заснаваны на падзяляемых большасцю жыхароў *каштоўнасцях*» [11, с.58]. Селянін як суб’ект культуры спалучае ў сабе шэраг вытворчых відаў дзейнасці. Традыцыйна жыхары вёскі адначасова займаюцца і земляробствам, і жывёлагадоўляй, і рознымі рамёствамі. *Праца* для селяніна з’яўляецца натуральнай формай яго існавання Магчыма гэтым тлумачыцца адсутнасць змрочнасці ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паказе працы паэтам. Культуралагічны дыскурс коласаўскіх тэкстаў дае падставу сцвярджаць, што праца разглядаецца паэтам як важнейшая частка аксіясферы, яе важнейшая каштоўнасць. У творах Коласа шмат старонак прысвечана мастацкаму апісанню, здавалася б, звычайных прылад гаспадарчай дзейнасці: / « А пад паветкаю прылады: / Вазок, калёсы, панарады, / Старыя сані, восі, колы / І вулляў некалькі на пчолы …»
[10, с.36 ].

У іерархіі каштоўнасцей сацыяльных субкультур дамінантную ролю адыгрывае *свабода*. Іманентны разгляд коласаўскага тэксту паказвае, наколькі важнай для паэта была праблема знешняй і ўнутранай свабоды. Кантэкстуальнае прачытанне коласаўскіх твораў сведчыць: паэта хваляваў гістарычны лёс Беларусі, ён не ўяўляў існавання беларускага народа без сацыяльнай і духоўнай свабоды. Вызначальнай ідэяй яго твораў з'яўляецца абарона свабоды індывідуальнай, свабоды селяніна. У паэме «Новая зямля» таксама ідзе гаворка не толькі аб дабрабыце селяніна, але і аб катэгорыях духоўных, такіх, як пачуццё свабоды, незалежнасці, якой так прагне Міхал. Лінія сацыяльных паводзін галоўнага героя паэмы – гэта пошук свабоды. Ляснік і яго сям'я мараць аб уласнай зямлі, у набыцці якой ім бачацца воля, незалежнасць: « Даўно ўжо бацька жыў думою / Разжыцца ўласнаю зямлёю / І не належаць ні да кога, / Не знаць начальства ніякога» [10, с.51].

Дыскурс тэкстаў творчай спадчыны Я. Коласа пацвярджае, што ў ёй адлюстраваны такія традыцыйныя каштоўнасці вясковай субкультуры, як *талерантнасць, цярпенне*. Так, Міхал прагна, цярпліва шукае вызвалення з-пад панскай улады. Усё ў ім падпарадкавана імкненню набыць зямлю, вырвацца з лесніковай пасады. Гэтая ідэя-мара становіцца сэнсам яго жыцця. Дзеля яе Міхал гатовы цярпець часовае прыніжэнне, зносіць насмешкі, кпіны. Але цярпенне гэта не рабскае. Пад знешняй абалонкай пакорлівасці тояцца нязломнасць, сацыяльны пратэст, пачуццё ўласнай годнасці, якія дапамагаюць селяніну ўпарта імкнуцца да сваёй жыццёвай мэты.

*Калектыўная творчая дзейнасць* народа з'яўляецца неаддзельнай часткай яго субкультуры. У ёй знітоўваецца ўсё лепшае, рацыянальнае і каштоўнае, што назапашана этнасам на працягу тысячагоддзяў. У вуснай паэтычнай творчасці, музыцы, танцы, тэатры, выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве адлюстроўваюцца працоўная дзейнасць, грамадскі і бытавы ўклад жыцця, культы і вераванні, рэлігійныя і сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці кожнага народа. «В устном народном творчестве, – адзначаў Якуб Колас у сваім артыкуле « Что было, что стало»,– глубоком и мудром, как сам народ, он выразил свои чаяния, надежды на торжество правды, высказал свое отношение к религии и ее представителям, к царской власти и ее прислужникам и всему существующему порядку» [7, с.32].

Аналіз тэкстаў мастацкіх твораў сведчыць: Колас уключаў разнастайныя жанры фальклору ў літаратурныя тэксты з мэтай узнаўлення натуральных вербальных сродкаў камунікацыі, увядзення іх у моўную практыку, садзейнічання іх засваенню. У коласаўскай літаратурнай спадчыне значнае месца займаюць *казачныя тэксты*, у якіх выдумка, узведзеная казкамі ў абсалютную ступень як катэгорыя эстэтычная, выступае ў адзінстве з народнай этыкай. Па нашых падліках, у чатырнаццацітомнае выданне твораў Я. Коласа ўключаны 42 казкі, сярод якіх дзве вершаваныя: «Дзед і мядзведзь», «Рак-вусач». Большасць казак з'яўляюцца народнымі, але па-майстэрску апрацаваныя пісьменнікам.

Я. Колас для паказу шырокай панарамы жыцця беларусаў, адметнасці нацыянальнага каларыту звяртаецца да багаццяў беларускай *народнай песні*. Так, значны ўнёсак дзеля псіхалагічнага адлюстравання тагачаснай рэчаіснасці, ідэйна-мастацкіх поглядаў і каштоўнасцей нашаніўскага перыяду прыпадае на народную песню ў апавяданнях «Соцкі падвёў», «Сацыяліст», «Знайшлі», трылогіі «На ростанях» і інш.

Аб уважлівым стаўленні Я. Коласа да жывога народнага слова сведчыць парэміялагічны пласт, пераважна ў яго празаічных творах. У тэкст апавяданняў, раманаў пісьменнік уводзіць мноства загадак, прыказак, прымавак, народных прыкмет і іншых формаў афарыстычнай малой прозы з багатай вясковай субкультуры беларусаў. З жанраў малой прозы ў творах Я. Коласа знайшлі адлюстраванне такія, напрыклад, адзінкі малых формаў беларускага фальклору, як праклёны (кленічы), своеасаблівыя слоўныя формулы з пажаданнем няшчасцяў і пакаранняў найчасцей чалавеку, жывёле. Кленічы часта

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўжываліся беларусамі ўсур'ёз і жартам. Вялікая колькасць кленічаў у беларускім фальклоры, мяркуем, тлумачыцца тым, што яны з'яўляліся своеасаблівай магічнай формай абароны, псіхічнай разгрузкі і ў пэўнай ступені псіхічнай агрэсіі. Коласаўскія літаратурныя тэксты паказваюць, што пісьменнікам кленічы ўжываюцца як сітуацыйна-бытавыя выразы, якія амаль не апрацоўваюцца ім, а ўводзяцца ў мову літаратурных герояў падчас іх эмацыянальных спрэчак.

Сацыяльная субкультура ахоплівае ўсю разнастайнасць аўтэнтычнай народнай творчасці, у тым ліку і такую сферу жыццядзейнасці, як *побыт*. Дыскурс літаратурных твораў Я. Коласа паказвае, што пісьменнік даволі шырока ўводзіў у раманы, апавяданні, аповесці, паэмы этнаграфічны кантэкст, надзвычай багаты і разнастайны. Наогул, фальклорным кантэкстам этнаграфічная спадчына Я. Коласа не абмяжоўваецца. Яна складаецца з прац уласна этнаграфічных і этнаграфічнага матэрыялу, які становіцца часткай мастацкай сістэмы твора, выкарыстоўваецца пісьменнікам для тыпізацыі абставін і індывідуалізацыі характараў. Да першых этнаграфічных твораў Я. Коласа даследчыкі яго творчасці адносяць такія, як «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле», «Аб сялянскіх забудовах (вёскі Люсіна Мінскай губерні Пінскага павета Хатыніцкай воласці)».

Асобныя бакі матэрыяльнай субкультуры вёскі раскрываюцца ў шэрагу замалёвак: «Палеская вёска», «Школа», «Зіма», «Перад навальніцаю ўночы», якія ўключаны у «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» [2]. У гэтых невялічкіх творах даецца дэталёвае апісанне беларускай вёскі, жылля і адзення палешукоў, як бедных, так і заможных. Кампаратыўны аналіз коласаўскіх этнаграфічных прац сведчыць: у адрозненне ад папярэдніх у «Другім чытанні для дзяцей беларусаў» утрымліваюцца не толькі простае апісанне, канстатацыя з'яў і працэсаў матэрыяльнай субкультуры, але і тлумачэнне іх прычын, у прыватнасці, у даступнай для дзіцячага ўспрымання форме.

Шматгранна адлюстраваны ў літаратурнай спадчыне Я. Коласа такі элемент матэрыяльнай субкультуры, як *ежа*. Тэматычная група лексем, якія абазначаюць ежу, вызначаюцца ў коласаўскіх творах стракатасцю і разнастайнасцю. Ежа разглядаецца аўтарам як своеасаблівы сімвалічны код у структуры свята. Рытуальныя стравы, паказвае Колас, залежалі ад пастоў. Так, святкаванне каляд пачынаецца з абрадавай вячэры, якая завецца куццёй. З выключным лірызмам паэт паказвае сімвалічнае значэнне куцці: «І вось цяпер гаршок з куццёю, / Як цар даўнейшаю парою, / У пачэсны кут, на свой прастол, / Стаўляўся з гонарам на стол» [10, с.202 ]. Вялікодны стол пісьменнік дэталёва апісвае ў трылогіі «На ростанях» [9, с.574 ].

*Адзенне* ўтрымлівае ў сабе гістарычны вопыт народа, кадзіруе яго, захоўвае і транслюе. Яно выступае ў літаратурнай спадчыне Я. Коласа як складаная інтэграваная сістэма знакаў сімвалічнага характару, своеасаблівы мастацкі вобраз адметнасці і культурных дачыненняў і ўзаемаўплываў этнасаў, якія спрадвеку жылі на гэтай зямлі.

У трылогіі «На ростанях», паэме «Новая зямля», апавяданні «Пракурор», аповесці «На прасторах жыцця» Якуб Колас увасабляе таксама многія субкультурныя ўтварэнні беларускага *горада*. Да Коласа побыт беларускага мястэчка, і яшчэ ў меншай ступені горада, мастацкай літаратурай быў закрануты слаба, традыцый амаль не існавала. Колас стварае шэраг вобразаў гараджан, паглыбляецца ў іх псіхалогію, унутраны свет. Асабліва поўна выпісана субкультура інтэлігенцыі. Пісьменнікам створаны цэласны, па-мастацку пераканальны тып суб'екта гарадской культуры на прыкладзе самай шырокай, дэмакратычнай яе праслойкі – настаўніцтва.

Важнейшай для інтэлігенцыі каштоўнасцю, на думку Коласа, з'яўляюцца *веды*. Андрэй Лабановіч з аповесці «На ростанях» і яго калегі – людзі начытаныя. Лабановіч падчас вучобы ў семінарыі чытаў не толькі падручнікі, але і працы Ч. Дарвіна, Г. Бокля, Г. Спэнсэра. Так, у спрэчцы з настаўнікам Турсевічам аб сэнсе жыцця ён выказвае думкі з этычнага вучэння англійскага філосафа Г. Спэнсара.

Дамінантай эпістэмалагічных уяўленняў носьбітаў субкультуры інтэлігенцыі з'яўляецца комплекс каштоўнасных арыентацый і рэгулятараў. У якасці базавых Я. Колас вылучае *дзейнасць*, якая спачатку скіравана ў яго літаратурных герояў на маральна-этычныя, філасофскія пошукі. Маладыя настаўнікі імкнуцца пазнаць сутнасць быцця, законы існавання Сусвету і грамадства. Яны – натуры шчырыя, дзейсныя, рашуча супрацьўляюцца абывацельшчыне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Суб’ектам інтэлігенцкай субкультуры ўласцівы шырокія *грамадскія імкненні*. Інтэлігенты-дэмакраты жывуць і дзейнічаюць не ў штучных, прыдуманых, а ў рэальных, канкрэтных гістарычных умовах. Маладыя настаўнікі імкнуцца расштурхаць, абудзіць вяскоўцаў ад летаргічнага сну, падняць на калектыўную грамадскую працу. Так, у Цельшыне і Мікуцічах Лабановіч спрабуе далучыць сялян да працы па добраўпарадкаванні вуліц, падворкаў, грэблі.

Пісьменнік адзначае *самаахвярнасць*, уласцівую інтэлігенцыі; шмат каму з настаўнікаў прыйшлося прайсці праз турмы, катаргі. На тры гады былі асуджаны коласаўскія героі (Лабановіч, Уладзік, Тургай), астрог стаў для іх школай сацыяльнай навукі.

З коласаўскіх тэкстаў вынікае, што сапраўдныя чалавечыя, грамадзянскія якасці інтэлігент праяўляе не толькі ў экстрэмальнай сітуацыі, але і ў паўсядзённым жыцці. Найпершае значэнне для асобы інтэлігента мае *праца*. Па ўяўленні інтэлігента, чалавек абавязкова павінен рабіць штосьці карыснае для іншых людзей, ніхто не мусіць есці дармовы хлеб. Колас паказвае, што сапраўдны інтэлігент не церпіць беспарадку, нядбайства і ўсё, што робіць, робіць з поўнай аддачай.

У трылогіі «На ростанях», паэме «Новая зямля» створаны вобразы і *іншых суб’ектаў* гарадской субкультуры. Праўда, пададзены яны пісьменнікам контурна, эскізна, без дастатковага мастацкага паглыблення ў псіхалогію і ўнутраны свет. Так, у другой частцы другой кнігі «На новым месцы» Колас вывеў галерэю прадстаўнікоў розных палітычных плыняў. У горадзе Пінску Лабановіч на канспіратыўнай кватэры знаёміцца з Глебам, Грышам, Саламонам, якія высока ацанілі прапагандысцкую дзейнасць настаўніка. У трэцяй кнізе «На ростанях» перад чытачом паўстаюць вобразы супрацоўнікаў рэдакцыі беларускай газеты Мікіты Уласюка, Стася Гуляшака, Стафана і Яся Ліскоўскіх. Колас паказвае іх як сапраўдных інтэлігентаў-дэмакратаў, якія рупяцца аб асветніцтве, родным словам змагаюцца за народную справу. Сціслыя, сінтэтычныя характарыстыкі даюцца мінскай інтэлігенцыі, з якой сутыкаецца Андрэй Лабановіч. Адмоўнымі рысамі надзелены гарадскі настаўнік Балоціч, рэдактар Шміт, стацкі саветнік Бабека, суддзі Бужынскі, Кіслоўскі, Верхаводаў.

Такім чынам, можна адзначыць, што ў літаратурнай спадчыне Я. Коласа шмат персанажаў – носьбітаў гарадской субкультуры. Яны прадстаўлены не толькі інтэлігенцыяй. У паэме «Новая зямля» пададзены гараджане іншых сацыяльных груп. Гэта пісары, іх памочнікі, гарадавыя, служачыя банка і іншыя гарадскія чыноўнікі. Фарбы ў гэтага сацыяльнага пласта гарадской субкультуры ў Коласа нязменна сатырычныя.

Беларускі горад у пачатку XX ст. фарміраваўся таксама за кошт вясковага паўпралетарыяту, беззямельных сялян, якія папаўнялі шэрагі рабочых. Колас не абыходзіць гэты сацыяльны слой і спрабуе выявіць культурныя адметнасці *гарадскіх працаўнікоў*. Субкультуры горада адрозніваюцца адна ад другой спецыфічным *стылем жыцця і паводзін*. Пісьменнік з уласцівай яму грунтоўнасцю адлюстроўвае грамадскі побыт горада. У трылогіі «На ростанях», паэме «Новая зямля» намалявана гарадское жыццё ва ўсіх яго праявах. Колас аналізуе асаблівасці архітэктуры тагачаснага горада, комплекс адзення гараджан, рэгламентацыю грамадскіх паводзін.

Такім чынам, беларускую культуру XX ст. Я. Колас рэпрэзентуе як складаны спектр культурных тэндэнцый, стыляў, традыцый і субкультурных феноменаў. Субкультурныя ўтварэнні адлюстроўваюць сацыяльныя асаблівасці развіцця этнакультуры беларусаў. Творчая спадчына пісьменніка прадстаўляе нам каштоўнасці, нормы, уяўленні, светапогляд, лад жыцця, гаспадарчы побыт жыхароў вёскі, асаблівасці архітэктуры, адзення, ежы, святочных абрадаў і рытуалаў.


1. *Беларусы:* вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 433 с.: іл.

2. *Колас, Я.* Другое чытанне для дзяцей беларусаў / Я. Колас; прадм. Л. Сеўрук. – Пб.: «Загляне сонца і ў наша ваконца»: «Наша хата», 1909. – 112 с.

3. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1972. –Т. 1. – 526 с.: іл.

4. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1973. – Т. 3. – 408 с.: іл.

5. *Колас, Я.* Збор твораў: у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1973. –Т. 4. – 352 с.: іл.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Колас, Я.* Збор твораў у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1973. – Т. 5. – 640 с.: іл.
7. *Колас, Я.* Збор твораў у 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1976. – Т. 12. – 528 с.
8. *Колас, Я.* Сымон-музыка: паэма: для сярэд. і ст. шк. узросту / Я. Колас. – Мінск: Юнацтва, 1991. – 270 с.: іл.
9. *Колас, Я.* На ростанях: трылогія / Я. Колас. – Мінск: Дзярж. вучэб.-пед. выд-ва Мін-ва асветы БССР, 1958. – 697 с.
10. *Колас, Я.* Новая зямля: паэма / Я. Колас; агульн. рэд., паслясл. Я. Янушкевіча; уклад.: У. Гілеп, Я. Янушкевіч; прадм. М. Мушынскага; пер. на рус. С. Гарадзецкага [і інш.]; пер. на пол. Ч. Сэнюха; камент. М. Мушынскага, Я. Янушкевіча; маст. В. Шаранговіч. – Мінск: БФК, 2002. – 904 с., 91 л. іл.
11. *Смолік, А.І.* Вясковая субкультура і яе адлюстраванне ў творах Я. Коласа / А. І. Смолік // Культура. Наука. Творчество: материалы III Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 23–24 апр. 2009 г.) / науч. ред. М. А. Можейко. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2009. – 58–67 с.

*O. VIARBITSKAYA*

**VALUES AND THEIR INCARNATION IN THE HERITAGE OF Y. KOLAS**

The contents and the essence of subcultures reflected in Yakub Kolas's works are analyzed in the article. The main elements of subcultures formed in different social groups of the Belarusian society are defined. The article contains scientifically grounded reasons for cultural orientation of the national poet's creative heritage.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 12.03.2010.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ